Спорт-тайм: наш фармат

ПОСПЕХ ДА ПЕКІНА ДАВЯДЗЕ

У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем, чым жывуць спартсмены напярэдадні Алімпіяды

ЛІЧБА ТЫДНЯ. Дзесяць медалёў заваявалі беларускія параалімпійцы на чэмпіянаце свету па лыжных відах спорту, які завяршыўся ў нарвежскім Лілехамеры. У скарбонцы беларусаў чатыры залатыя, тры сярэбраныя і тры бронзавыя медалі ў спаборніцтвах па біятлоне і лыжных гонках. Двойчы на вышэйшую ступень п'едэстала падымалася Святлана Сахоненка, яна заваявала і «серабро». Святлана Сахоненка, Валянціна Шыц, Аркадзь Шыкуць і Мікіта Ладзесаў сталі бронзавымі прызёрамі ў змяшанай эстафеце. Валянціна Шыц таксама заваявала яшчэ два «серабра» і адну «бронзу» ў асабістых гонках. Дзве ўзнагароды вышэйшай пробы і адну бронзавую заваяваў Юрый Голуб.

На гэтым чэмпіянаце планеты Беларусь прадстаўляла больш за 20 спартсменаў, а ўсяго ў Лілехамеры выступала каля 800 атлетаў з усёй планеты. Гэта першы параалімпійскі чэмпіянат свету па снежных відах — лыжных гонках, горных лыжах, біятлоне і снаўбордзе, які праходзіў у адной краіне. Цяпер група беларускіх біятланістаў і лыжнікаў адправілася ў шведскі Эстэрсунд, дзе адбудзецца заключны этап Кубка свету перад Параалімпіядай-2022. Зімовыя Параалімпійскія гульні пройдуць у Пекіне з 4 да 13 сакавіка.

ГЕРАІНЯ ТЫДНЯ. Дзінара Алімбекава стала другой у жаночым масстарце на сёмым этапе Кубка свету па біятлоне ў італьянскім Антхольцы. Да самага фінішу дыстанцыі ў 12,5 кіламетра беларуска прэтэндавала на перамогу, але ўступіла пераможцы Даратэі Вірэр 3,7 секунды пры выстрале міма. Італьянская біятланістка паказала час 35 хвілін 58,7 секунды.

Пасля сямі этапаў Кубка свету Дзінара Алімбекава паднялася на другі радок у агульным заліку Кубка свету. Цяпер у яе актыве 589 балаў. Наперадзе толькі нарвежка Мартэ Райселан, у якой 651 бал. Лідар мужчынскай беларускай каманды Антон Смольскі займае 10-ю пазіцыю, маючы ў сваім актыве 405 балаў.

МЕДАЛІ ТЫДНЯ. Беларускія канькабежцы выступаюць на заключным этапе юніёрскага Кубка свету, які праходзіць у аўстрыйскім Інсбруку. У актыве беларускай каманды ўжо тры залатыя медалі. Ягор Дамарацкі перамог на дыстанцыі 3000 метраў, на гэтай жа дыстанцыі найлепшай стала і Ганна Кавалёва. Віктар Рудэнка прыехаў першым да фінішу дыстанцыі на 1000 метраў. У мужчынскім камандным спрынце зборная Беларусі стала сярэбраным прызёрам.

ЛІЦЭНЗІЯ ТЫДНЯ. Беларусь атрымала дадатковую ліцэнзію на зімовыя Алімпійскія гульні ў Пекіне. Пропуск на галоўныя старты чатырохгоддзя атрымала Анастасія Андрыянава, якая спецыялізуецца ў лыжнай акрабатыцы. Размяркоўвалі дадатковыя квоты па рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі лыжнага спорту (FIS), згодна з якім для Беларусі была выдзелена яшчэ адна ліцэнзія. У гэтым сезоне Кубка свету 17-гадовая Анастасія Андрыянава ўзяла ўдзел у пяці стартах. Найлепшы вынік беларускі — 9-е месца на этапе ў фінскай Руцы, таксама спартсменка двойчы фінішавала ў асабістых турнірах на 16-й пазіцыі.

НАМІНАЦЫІ ТЫДНЯ. Міжнародная федэрацыя футбола назвала найлепшых гульцоў і трэнераў мінулага года. Цырымонія The Best FIFA Football Awards — 2021 прайшла ў Цюрыху ў анлайн-фармаце. Найлепшым футбалістам планеты прызнаны польскі форвард мюнхенскай «Баварыі» Роберт Левандоўскі. 33-гадовы нападаючы стаў самым выніковым гульцом 2021 года, забіўшы 69 мячоў за «Баварыю» і зборную Польшчы. Найлепшым варатаром стаў Эдуар Мендзі (Сенегал; «Чэлсі», Лондан, Англія). Найлепшым трэнерам названы нямецкі настаўнік лонданскага «Чэлсі» Томас Тухель. Аўтарам самага прыгожага гола стаў аргенцінскі паўабаронца лонданскага «Тотэнхэма» Эрык Ламела. Сярод жанчын найлепшай футбалісткай прызнана іспанка Алексія Пуцяльяс. Англічанка Эма Хейз стала найлепшым трэнерам жаночых каманд.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота з адкрытых крыніц.

Даты Падзеі Людзі

25 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1902 год — нарадзіўся (хутар Альховікі, цяпер у Шумілінскім раёне) Пётр Захаравіч Калінін, партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Быў на партыйнай і савецкай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну — другі сакратар ЦК КП(б)Б, адначасова — член Ваеннага савета 21-й арміі, намеснік начальніка штаба партызанскага руху пры Ваенным савеце Заходняга фронту, з верасня 1942 года — начальнік Беларускага штаба партызанскага руху. З 1944-га — першы сакратар Гродзенскага абкама КП(б)Б, з 1948-га — намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, пасля — міністр саўгасаў; дарожнай і транспартнай гаспадаркі; хлебапрадуктаў БССР.

1912 год — нарадзіўся (в. Пеніца, цяпер у Калінкавіцкім раёне) Уладзімір Аляксандравіч Барысенка, Герой Савецкага Саюза. Удзельнік паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь у 1939 годзе, савецка-фінскай вайны (1939—1940). У Вялікую Айчынную вайну на Ленінградскім і 2-м Беларускім франтах. Удзельнік прарыву блакады Ленінграда, вызвалення Прыбалтыкі, Беларусі. Камандзір артылерыйскага палка маёр Барысенка вызначыўся ў лютым 1944 года пры прарыве варожай абароны каля г. Ламаносаў (Ленінградская вобл.): артылерысты палка знішчылі магутныя ўмацаванні, дзясяткі танкаў і гармат саперніка. Пасля службу ў Савецкай Арміі.

1972 год — Мінск стаў 11-м горадам у СССР з насельніцтвам больш за 1 млн чалавек.

У свеце

1554 год — у дзень святога Паўла на паўднёвым усходзе Бразіліі, у даліне ракі Ціетэ, партугальскімі езуітамі быў заснаваны горад Сан-Паўлу.

1832 год — нарадзіўся Іван Іванавіч Шышкін, рускі жывапісец, адзін з найбуйнейшых майстроў рэалістычнага пейзажнага жывапісу. Напісаў карціны «Раніца ў сасновым лесе», «Жыта» і іншае. У 1883 і 1892 гадах прыязджаў у Беларусь, дзе стварыў шэраг краявідаў Палесся. Стварыў 20 эцюдаў у Белавежскай пушчы. Сярод іх «Сухастой», «У Белавежскай пушчы», «Буралом» і іншае. У 1893 годзе Шышкін арганізаваў выставу сваіх палескіх работ у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў.

1882 год — нарадзілася Вірджынія Вулф, англійская пісьменніца і літаратурны крытык. Аўтар раманаў «Місіс Дэлаўэй», «Да маяка», «Хвалі».

1915 год — вынаходнік Аляксандр Бэл правёў першы трансамерыканскі сеанс тэлефоннай сувязі (Нью-Ёрк — Сан-Францыска).

1924 год — у горадзе Шамані, на ўсходзе Францыі, адкрыліся першыя зімовыя Алімпійскія гульні.



АВІЦЭНА:

Так гаварыў...

«Паніка — гэта палавіна хваробы. Спакой — гэта палавіна здароўя. Цярпенне — палавіна выздараўлення».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.08	17.37	8.29
Віцебск —	9.03	17.21	8.18
Магілёў —	8.58	17.27	8.29
Гомель —	8.48	17.30	8.42
Гродна —	9.22	17.53	8.31
Брэст —	9.16	18.00	8.44

Месяц

Апошняя квадра ў 16.40. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Пятра, Савы, Таццяны.*
К. *Генрыха, Ірэны, Мілаша, Паўла, Таццяны, Эльвіры, Яна.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Першабытным дзецям даводзілася гуляць у «Камень-камень-камень».

Скажы, што ты пра мяне думаеш, і я скажу табе: «Сам дурань!».

— Скажы, табе падабаецца мне ўвесь час рабіць балюча?

— Не зразумеў.

— Ты ўвесь час кажаш, што ў цябе ўсё добра, і пацвярджаеш гэта сваёй шчаслівай фізіяноміяй.

Патраціў назапашаныя за святы радасць і супакаенне на адну паездку ў аўтобусе.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 79. Нумар падпісаны ў 19.30

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

24 студзеня 2022 года.